# УСТАЎНАЯ ГРАМАТА

## РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ.

Год назад народы Беларусі разам з народамі Расіі скінулі ярмо расійскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь; ні пытаючыся народу, ен укінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія.

Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскія цары на наш вольны і незалежны край.

Ад гэтага часу **Беларуская Народная Рэспубліка абвешчаецца Незалежнай і Вольнай Дзяржавай.** Самі народы Беларусі, у асобе свайго **Устаноўчага Сойму**, пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На моцы гэтага трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасьць чужому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Берэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы зямлю яго на часткі.

На моцы гэтага ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсьці ў адносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім перагледзіць тую часьціну **Берэсьцейскага Трактату**, якая датычыць Беларусі, і падпісаць міравую ўмову з усімі ваеваўшымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а ласьне: **Магілеўшчыну, беларускія часьці Меншчыны, Гродзеншчыны (з Гроднай, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губерняў, заселеныя беларусамі.**

Беларуская Народная Рэспубліка падцьверджывае ўсе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны **Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 году.**

Абвешчаючы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што **ўсе любячые волю народы** дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры здзейсьніць яго палітычна-дзяржаўные ідэалы.

**Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.**

Дана ў Менску-Беларускім
25 сакавіка 1918 году.